Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 31 (722) ● ● Пятніца, 15 лістапада 1968 г. ● Год выдання XXII Цана 2 кап.

У СЁННЯШНІМ НУМАРЫ:
● ЮБІЛЕЙ ВЯЛІКАГА ПІСЬМЕННІКА ● Насустрач 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна ● Фальклорная практыка ● У будучых геолагаў

## ВУЧАЦЦА І СТУДЭНТЫ, І ВЫКЛАДЧЫКІ

**Напярэдадні свята Кастрычніка ў нашым універсітэце адбылася Рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя па грамадскіх навуках. У яе рабоце прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, Акадэміі Навук БССР, адказныя супрацоўнікі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Такая канферэнцыя праводзілася ў нас упершыню, таму не дзіўна, што на абмеркаванне было прадстаўлена некалькі дзесяткаў дакладаў, што яе работа выклікала вялікую зацікаўленасць грамадскасці рэспублікі. Многія газеты далі разгорнутыя справаздачы. Матэрыялы канферэнцыі вырашана надрукаваць асобнай кніжкай. Гэта даручана універсітэцкаму выдавецтву.**

**Выбар нашага універсітэта месцам правядзення канферэнцыі не выпадковы. Тут працуюць апорныя кафедры па грамадскіх навуках, у старэйшай навучальнай установе Беларусі накоплен вялікі вопыт выкладання гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі, палітычнай эканоміі і іншых дысцыплін. Аб гэтым вопыце падрабязна расказалі гасцям прафесары У. М. Сікорскі, І. М. Лушчыцкі, М. Я. Шкляр, дацэнты А. А. Філімонаў, А. С. Кляўчэня, П. У. Грышановіч і іншыя выкладчыкі універсітэта.**

**Удзельнікі канферэнцыі дамовіліся часцей сустракацца для вырашэння метадычных пытанняў выкладання грамадскіх навук, раз-гарнуць у гэтым напрамку навуковыя даследаванні. Знамянальна, што ўслед за форумам па методыцы ва універсітэце адбылася Рэспубліканская навуковая студэнцкая канферэнцыя па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. Яна была прысвечана 50-годдзю ВЛКСМ і 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. На канферэнцыі былі падведзены вынікі другога тура ўсесаюзнага агляду студэнцкіх даследаванняў па грамадскіх навуках. Пераможцы атрымалі граматы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і ЦК ЛКСМБ, каштоўныя падарункі. Працы, аднесеныя да першай катэгорыі, рэкамендаваны на заключны тур, дзе будуць вызначаны лаўрэаты конкурсу. Сярод іх— работы пятнаццаці універсітэцкіх аўтараў. Як і ў мінулым годзе, тэзісы лепшых прац будуць надрукаваны ў асобным зборніку.**

**Прайшоўшыя ва універсітэце канферэнцыі сталі своеасаблівай школай павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і перадавога вопыту ў студэнцкіх навуковых даследаваннях.**







## У СВЯТОЧНЫХ КАЛОНАХ

*Урачыста адзначыў калектыў нашага універсітэта 51-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка. У гонар гэтай знамянальнай даты ў галоўным корпусе адбыўся вялікі святочны вечар.*

*А 7 лістапада студэнты і выкладчыкі прынялі ўдзел у дэманстрацыі працоўных сталіцы. У святочнай калоне плячом к плячу ішлі прадстаўнікі шматнацыянальнай універсітэцкай сям'і.*

*Разам з савецкімі людзьмі свята Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі адзначылі замежныя студэнты, якія вучацца ў БДУ.*

*На здымках: (зверху ўніз) галоўная універсітэцкая калона; на дэманстрацыі выкладчыкі і студэнты падрыхтоўчага факультэта; паказваюць сваё майстэрства удзельнікі танцавальнага калектыву.*

*Фота М. НІЧЫПАРЭНКІ.*

ДА 150-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ І. С. ТУРГЕНЕВА

## ГОРДАСЦЬ РУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*У нашым універсітэце шырока адзначана 150-годдзе з дня нараджэння вялікага пісьменніка зямлі рускай Івана Сяргеевіча Тургенева.*

*У бібліятэцы універсітэта, а таксама ў кабінеце рускай класічнай літаратуры былі аформлены выстаўкі твораў пісьменніка.*

*На філалагічным факультэце прайшлі тургенеўскія чытанні. З дакладамі, прысвечанымі творчай дзейнасці І. С. Тургенева, выступілі супрацоўнікі кафедры рускай класічнай літаратуры, а таксама студэнты-філолагі.*

*Асабліва змястоўнымі і цікавымі былі выступленні студэнтаў Кароткага, Тыліндус, Ануфрыева, Раманенка і іншых.*

*Рэдкалегія газеты «Слова філолага» прысвяціла 150-годдзю з дня нараджэння І. С. Тургенева спецыяльны выпуск. Некаторыя матэрыялы з яго мы змяшчаем у сённяшнім нумары.*

Творчасць Івана Сяргеевіча Тургенева, вялікага, своеасаблівага пісьменніка, складае цікавую старонку ў гісторыі айчыннай і сусветнай літаратуры. Праўда чалавечых характараў, створаных ім, сіла рэалізму і сёння хвалюе чытачоў розных краін і кантынентаў.

Спадчына пісьменніка выключна шматгранная. Лірыка, паэмы, апавяданні, нарысы, цудоўныя аповесці і шэсць раманаў, кожны з якіх выклікаў самую жывую зацікаўленасць чытачоў і крытыкаў, станавіўся вехай у развіцці рускай мастацкай прозы; драматычныя творы, якія да цяперашняга часу ўваходзяць у рэпертуар многіх тэатраў свету, і, нарэшце, у вышэйшай ступені вершы ў прозе — усе гэтыя жанры аказаліся даступнымі майстэрству Тургенева.

Пісьменнік- празаік, паэт, драматург і крытык, адзін з найбольш вялікіх стылістаў у сусветнай літаратуры пастаянна вёў барацьбу за ўмацаванне рэалізму, нацыянальную самабытнасць і своеасаблівасць рускай літаратуры. Яго творы выключна папулярныя. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі яны выдаваліся ў Савецкім Саюзе 1020 разоў. Да 150-годдзя з дня нараджэння мастака выдавецтва «Навука» заканчвае першае акадэмічнае поўнае выданне збору твораў і пісем Тургенева ў 28-мі тамах, які павінен уключыць усе яго творы як апублікаваныя, так і пакінутыя ў рукапісах. З году ў год перакладаюцца і занава выдаюцца ў многіх краінах свету творы пісьменніка, у тэатрах ставяцца яго п'есы.

У сваіх творах Тургенеў, як правіла, зыходзіць з доб-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## РЭВАЛЮЦЫЯЙ АКРЫЛЁНЫЯ

**Яшчэ ў школе нам расказалі аб Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Свята Кастрычніка на сваёй Радзіме мы сустракалі кожны год. А сёлета мы сустралі яго на радзіме вялікага Леніна.**

**Кастрычніцкая рэвалюцыя аказала вялікі ўплыў на нашу Жнівеньскую рэвалюцыю і зараз натхняе на барацьбу з амерыканскімі імперыялістамі. Наш любімы паэт То Хыу вобразна пісаў у адным са сваіх твораў, што Жнівеньская рэвалюцыя В'етнама — малодшая сястра Вялікага Кастрычніка. У цяжкія дні, калі панавалі французскія каланізатары, в'етнамскі народ падняўся на барацьбу за свабоду і незалежнасць Радзімы. Зараз мы вядзем барацьбу з амерыканскімі агрэсарамі.**

**Мы, сыны і дочкі гераічнага В'етнама, якія прыехалі на вучобу ў СССР, стараемся дасягнуць у гэтай нялёгкай справе вялікіх поспехаў, мы будзем вучыцца на добра і выдатна. Нас натхняе брацкі савецкі народ, які высока паднаў і нясе сцяг марксізма-ленінізма.**

**ХОАНГ МУЙ,**
студэнт падрыхтоўчага факультэта.



Тут, у лабараторыі, студэнты адчуваюць сябе сапраўднымі даследчыкамі.

На здымку: студэнтка II курса хімфака Святлана Архіпава на практычных занятках па аналітычнай хіміі.

*Фота І. АСКІРКІ.*

## ВЫСОКІЯ ЎЗНАГАРОДЫ

**Напярэдадні свята намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Ф. Клімаў уручыў урадавыя ўзнагароды вялікай групе ўзнагароджаных.**

**Ганаровыя граматы Вярхоўнага Савета БССР былі ўручаны і дацэнтам нашага універсітэта Героям Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскаму і А. А. Філімонаву, узнагароджаных за актыўную навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння.**

**Высокая ўзнагарода была таксама уручана і загадчыку кафедры рускай савецкай літаратуры прафесару Л. І. Фігloўскай.**

**Прымаючы ўзнагароды, яны горача падзякавалі Камуністычнай партыі за высокую ацэнку іх працы і заверылі, што прыкладуць усе свае сілы, каб апраўдаць аказанае ім давер'е.**

**Пасля ўручэння урадавых узнагарод І. Ф. Клімаў павіншаваў прысутных з наступленнем свята Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і пажадаў усім далейшых поспехаў у іх дзейнасці.**

# ГОРДАСЦЬ РУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

ра яму вядомых фактаў жыцця, з канкрэтнай рэчаіснасці. Ён упэўнен, што вышэйшая вартасць мастака заключаецца ва ўменні ўзнавіць ісціну, «рэальнасць жыцця», нават калі гэта ісціна не адпавядае яго сімпатыям. Такую задачу пісьменнік ставіў перад сабою ва усіх творах.

Сусветнае значэнне атрымалі цудоўныя «Запіскі паляўнічага», у якіх, працягваючы і ўзбагачаючы вялікія рэалістычныя традыцыі Пушкіна і Гогаля, Тургенеў прадставіў шырокую карціну народнага жыцця. «Колькі вы ні пішыце аповесцей і драм, — усхвалявана гаварыў І. А. Ганчароў, — вы не апярэдзіце вашай Іліяды, вашых «Запісак паляўнічага».

Аднак Ганчароў аказаўся не зусім праў: кожны раман, напісаны пасля «Запісак паляўнічага» («Рудзін», «Дваранскае гняздо», «Напярэдадні», «Бацькі і дзеці», «Дым», «Навіна»), станавіўся падзеяй у жыцці рускага грамадства і сведчыў аб вялікім майстэрстве тургенеўскай прозы.

Творы пісьменніка поўны высокай маральнай чысціні, сардэчнага, задушэўнага і ўзвышанага пачуцця, яны пранікнуты «глыбокай верай у перамогу свету, дабра і маральнай прыгажосці». Праз усе стадыі яго мастацкага развіцця праходзіць імкненне да свабоды чалавечай асобы, да гармоніі чалавека і прыроды.

Творы Тургенева ўваходзяць у жыццё кожнага чалавека ў дзяцінстве, калі яго па-сапраўднаму хвалююць сімпатычныя хлопчыкі з апавядання «Бежын луг», таленавіты спявак Якаў, выклікае абурэнне пані з апавядання «Муму»; старшакласнікаў пакарае мужны Базараў, людзей усіх узростаў хвалюе ў апавяданнях, аповесцях і раманах пісьменніка жыццёвая праўда, высакароднасць і чысціня маральных ідэй, сіла розуму і таленту, прыгажосць і ўдасканаленасць формы. Творы Тургенева перадаюцца з пакалення ў пакаленне як цудоўныя ўзоры рускага рэалістычнага мастацтва.

# ТУРГЕНЕЎ У ШКОЛЕ

**Урок рускай літаратуры у 9-м «А» класе сярэдняй школы № 75. Яго вядзе сёння Валодзя Дзіхціеўскі, студэнт пятага курса. Уявіце сабе сорак пар зацікаўленых вачэй вучняў. Жывая цішыня класа. Валодзя спакойны. Актыўна вядзе апытванне. Здаецца, ён залішне строгі. Пры позірку на яго прападае думка аб свавольстве. Мы, студэнты і метадыст, як і рабяты, глядзім на Валодзю, быццам бачым яго ўпершыню.**

**Апытванне закончана. Валодзя называе тэму ўрока: «Вобраз Базарава ў рамане І. С. Тургенева «Бацькі і дзеці». Тэма старая і вечна новая. Яна неяк асабліва ўрачыста гучыць напярэдадні слаўнага юбілею пісьменніка. Мы глядзім на партрэт Тургенева, які вісіць у класе, потым пераводзім позірк на ілюстрацыі да рамана «Бацькі і дзеці». У цэнтры — Базараў, вялікі, знешне нязграбны, такі знаёмы нам. Тургенеўская атмасфера строгасці і задушэўнасці пануе ў класе.**

**Мэту свайго ўрока Валодзя бачыць у тым, каб рабяты задумаліся над класічным вобразам Базарава, зразумелі сутнасць гэтага вобраза — супаставілі яго погляды на жыццё, грамадства, навуку, мастацтва са сваімі ўласнымі.**

**Стараючыся як мага лепш і асцярожней умешвацца ў ход думак вучняў аб Базараве, студэнт умела падводзіць іх да глыбокай думкі абагульнення, зачытвае ўрывак з усхваляванага артыкула Д. І. Пісарава аб Базараве:**

**— Так, Базараў... прадстаўнік нашага маладога пакалення; у яго асобе згрупаваны тыя якасці, якія дробнымі долямі рассыпаны ў масах; і вобраз гэтага чалавека ярка і выразна вырысоўваецца перад уяўленнем чытача.**

**Многа цікавых думак выказваюць дзевяцікласнікі, характарызуючы Базарава. І ўсё гэта на аснове тэкста рамана — вось што каштоўна на ўроку Валодзі Дзіхціеўскага.**

**Вучні звяртаюць увагу на тое, што Тургенеў надаў свайму герою рысы рэвалюцыянера і матэрыяліста. «Калі ён называецца нігілістам, — гаварыў пісьменнік аб Базараве,— то трэба чытаць «рэвалюцыянерам».**

**У выніку гутаркі атрымліваецца вельмі цэльнае уяўленне аб Базараве — разумным, добрасумленным, дэмакратычна настроеным, крытычна думаючым маладым чалавеку шасцідзесятых гадоў мінулага веку. Характарыстыку вобраза падкрэслівае апісанне партрэта Базарава, якое зачытваюць вучні...**

**Званок перарваў размажанні дзевяцікласнікаў аб Базараве.**

**Чым жа адрозніваецца Базараў ад пакалення шасцідзесятых гадоў нашага неспакойнага веку! Спрэчка толькі пачалася... Што ж, наступны ўрок будзе працягам яе.**

**Сёння вучні адказалі на многія пытанні: хто такі Базараў, яго сацыяльнае паходжанне, партрэтная характарыстыка, заняткі яго, адносіны да жыцця і да людзей, да прыроды і навукі, мастацтва... і на шэраг іншых пытанняў. Іншы раз і адказы гучалі як пытанні. На дапамогу своечасова прыходзіў Валодзя Дзіхціеўскі.**

**Урок прайшоў напружана, у творчых пошуках вучняў. Высокая актыўнасць — вынік узаемнай працы настаўніка і класа.**

**Валодзю прыйшлося шмат папрацаваць для таго, каб атрымалася задушэўная гутарка з вучнямі. Гэты ўрок — своеасаблівая сімфонія думак, і, як належыць у сімфанічным аркестры, першая скрыпка — найлепшаму скрыпачу, самаму падрыхтаванаму. Валодзя рыхтаваўся да ўрока цэлы тыдзень, перачытаў артыкулы Пісарава і Вароўскага, тэкст рамана, манаграфію аб творчасці І. С. Тургенева, метадычныя распрацоўкі па творчасці пісьменніка. Мэту сваю Валодзя бачыць у тым, каб 9 «А» палюбіў і Тургенева і цудоўны вобраз Базарава, каб перад сачыненнем па гэтаму вобразу думкі вучняў дасягнулі вышэйшай ступені «канцэнтрацыі».**

**Адмаўленне... анархічнае адмаўленне — бунт... адмаўленне ў імя ідэалу, аб якім пісаў яшчэ В. Р. Бялінскі... Чалавек — грамадства... Чалавек — прырода, мастацтва, навука, прыгажосць...— як гэтыя праблемы «ўлягуцца» ў думках вучняў, пакажуць у далейшым іх дамашнія сачыненні.**

**Але самае галоўнае дасягнута — вучні палюбілі Тургенева, пранікліся сімпатыяй да яго героя.**

**Е. МАЛАШОНАК.**





# СЁННЯ НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ

*Намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта Міхаіл Флякс сустрэўся з в'етнамскімі студэнтамі падрыхтоўчага факультэта. У цёплай задушэўнай гутарцы ён расказаў аб слаўным 50-гадовым шляху Ленінскага камсамола, аб дзейнасці універсітэцкай камсамоліі.*

**Загадчык кафедры навуковага намунізма дацэнт М. Р. Круцько прачытаў лекцыю аб міжнародным становішчы для савецкіх і замежных студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах №2 і №3 па вуліцы Бабруйскай.**

● Інтэрнацыянальны студсавет інтэрната № 3 аб'явіў агляд-конкурс на лепшы пакой.

**На апошнім пасяджэнні кафедры рускай мовы падрыхтоўчага факультэта (загадчык кандыдат філалагічных навук Т. П. Плешчанка) быў абмеркаван зборнік тэкстаў пад назваю «Героі Беларусі». Яго складальнікі — старшыя выкладчыкі Т. Л. Пятровіч, Л. Ф. Сакавец і А. В. Самаль. У абмеркаванні вучэбнага дапаможніка прынялі ўдзел старшыя выкладчыкі А. А. Рудэнка, З. Э. Іванова, М. С. Мяцельскі і дэкан факультэта кандыдат эканамічных навук М. К. Гарбачоў. Было адзначана, што, калі кніга выйдзе ў свет, яна будзе не толькі добрым вучэбным дапаможнікам на рускай мове для замежных студэнтаў і аспірантаў, але і цікавым, каштоўным сувенірам для нашых сяброў пры вяртанні іх на радзіму пасля заканчэння вучобы.**

● В'етнамскія студэнты наведалі дзіцячы сад № 125, дзе азнаёміліся з умовамі догляду і выхавання самых маленькіх савецкіх грамадзян.

# ЛІРЫЧНЫ ЭЦЮД

Сівы чалавек з сумнымі вачыма стаяў на набярэжнай Сены. Парыж жыў сваім шумлівым жыццём. Але гэта не перашкаджала чалавеку быць аднаму. Па цёмнай паверхні вады, кудысьці ў глыбіню сцякалі агні. На іх можна было глядзець і думаць. Або не думаць.

Яму ўжо за 60. Неяк незаўважальна падкралася старасць. Так, ужо можна гаварыць, што жыццё пражыта. Якімі былі яны, гэтыя 60 год, выслізнуўшыя так хутка?

Памяць услужліва выхоплівае з мінулага гады, падзеі...

«Ты і не так ужо дрэнна іх пражыў,— нашэптвае яна яму. — Ты можаш быць задаволеным!»

«Факты», — качае ён галавой.

«З чаго складаецца жыццё? З працы, любві, сяброўства. У цябе ўсё гэта было».

«Факты», — аспрэчвае ён.

«Добра. Памятаеш, гэта было яшчэ на тваёй Радзіме. Ты толькі нядаўна закончыў універсітэт. Адзін з сяброў гаворыць аб табе: «Паэт, талент, арыстакрат, прыгажун, багацей, разумны, адукаваны, дваццаць пяць год — я не ведаю, у чым яшчэ прырода адказала яму. Нарэшце, характар — настойліва упарты, цудоўны, выпрацаваны у выдатнай школе».

«Ах, — сумна ўсміхаецца ён. — Гэта суцяшэнне юнцу, а ў мяне сівыя валасы».

«А твая «Анібалава клятва?» Гэта ж ты пісаў: «Вораг гэты — прыгоннае права. Пад гэтым імем я сабраў і сканцэнтраваў усё, супраць чаго я вырашыў змагацца да канца—з чым я пакляўся ніколі не згаджацца. Гэта была мая «Анібалава клятва»... Я і на Захад прыйшоў дзеля таго, каб лепш яе выконваць, — паўтарыў ён услых і сарамліва ўсміхнуўся, злавіўшы сябе на гэтым. — Так, відаць, я і сапраўды старэю, калі размаўляю сам з сабой».

Страсянуўшы прыгожай львінай галавой, ён пакрочыў па набярэжнай.

«Любоў, не забудзь любоў», — напаміналa памяць.

Так, любоў. У жыцці ён любіў двойчы. Не, не тое. Ён любіў дваіх. Жанчыну і Радзіму. «Я нічога не бачыў на свеце лепш за Вас... Сустрэць Вас на сваім шляху было найвялікшым шчасцем майго жыцця, мая адданасць і ўдзячнасць не маюць граніц і памруць толькі разам са мною», — гэта ён пісаў яшчэ тады, амаль сорак год назад, але і цяпер ён думае так. Шчасце яму прынесла гэтая жанчына? Многія адказалі б—«не». У яго магла б быць сям'я, але на свеце жыла гэтая жанчына. І яна была замужам. У яго была толькі любоў. Любоў, якая працягваецца жыццё. Гэтая любоў клікала яго у Францыю. Але бужывальскімі начамі ён сумаваў па радзіме. Ён зноў ехаў у Расію і вяртаўся ў Францыю. У цёмных яго вачах пасяліўся смутак.

Сябры... Многіх ужо няма. Няма Някрасава. Няма Флабера. Час-каршун вынес многіх. Вось і яму ўжо за шэсцьдзесят. Не, гэта яшчэ не ўсё. «Гэта зусім мала, — ён і не заўважыў, як стаў зноў гаварыць услых.—Мы яшчэ паваюем!.. І няхай нада мною кружыць мой каршун...»

«Мы яшчэ паваюем, чорт вазьмі!»

**Н. МАРЫШАВА, студэнтка 4-га курса аддзялення рускай мовы і літаратуры.**





Як мы ўжо паведамлялі, на хімічным факультэце гасціў венгерскі спецыяліст доктар Е. Хаваш. На здымках нашага фотакарэспандэнта М. Нічыпарэнкі вы бачыце доктара Е. Хаваша у лабараторыях хімічнага факультэта. Абмен думкамі і вопытам праходзіў з вялікай зацікаўленасцю.

# РЭФОРМА ЧЫЛІЙСКІХ УНІВЕРСІТЭТАЎ

**Напярэдадні свята 50-годдзя Ленінскага камсамола наш універсітэт наведалі лацінаамерыканскія журналісты, якія знаходзіліся ў нашай краіне па запрашэнню Бюро ЦК ВЛКСМ. Госці пазнаёміліся з арганізацыяй навучальнага працэсу ў БДУ, агледзелі нашы вучэбныя карпусы, лабараторыі, бібліятэкі, сустрэліся з прадстаўнікамі рэктарата, партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый. На развітанне госці-журналісты пакінулі ў рэдакцыі нашай газеты артыкул, у якім расказваюць аб задачах і праблемах, што стаяць перад студэнцкай моладдзю лацінаамерыканскіх краін.**

Студэнты і выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў Чылі, як і іх браты з іншых краін Лацінскай Амерыкі, заўсёды змагаліся за змяненне старой структуры чылійскіх універсітэтаў. У гэтай барацьбе былі дасягнуты істотныя поспехі, але ненадоўга. Тагачасныя ўрады, якія абапіраліся на рэакцыйныя сілы, звялі на нішто ўсе гэтыя заваёвы.

Кончылася тым, што самыя буйныя вышэйшыя навучальныя ўстановы Лацінскай Амерыкі былі акружаны і заняты ўзброенай паліцыяй. У схватках загінула многа студэнтаў, якія абаранялі прадастаўленую універсітэту аўтаномію. У знак пратэсту многія выкладчыкі і нават рэктары адказаліся ад займаемых пасад.

Рэакцыя, якая наступіла пасля гэтага, усё вастрэй адчуваецца ў вышэйшых навучальных установах Лацінскай Амерыкі. Але барацьба за універсітэцкія рэформы не спынілася. У Чылі яна ніколі не дасягала такой вастрыні, як у апошнія гады. Сярод вну, якія першымі ўступілі ў барацьбу, неабходна адзначыць Дзяржаўны тэхналагічны універсітэт і каталічны ў Сант-Яга і Вальпараіса. Па іх слядах пайшоў і самы вялікі Чылійскі універсітэт.

Цяпер гэты рух ахоплівае восем вышэйшых навучальных устаноў, якія актыўна змагаюцца за тое, каб урад рэспублікі прыняў закон аб вышэйшай адукацыі адпаведна іх асноўным патрабаванням.

Трэба адзначыць, што да нядаўняга часу чылійскія вышэйшыя навучальныя ўстановы мелі архаічную структуру, народжаную сацыяльнай структурай грамадства. Але гэты час прайшоў. «Феадальнае» кіраўніцтва адступіла перад націскам рэфармістаў, уступіўшы месца ўладзе у тысячу раз больш дэмакратычнай. Цяпер кіраўніцтва выбіраецца ўсім універсітэтам (студэнтамі, выкладчыкамі, аспірантамі, навуковымі супрацоўнікамі і абслугоўваючым персаналам). Кіраўніцтва складае частку калегіяльнага арганізма, у якім таксама прадстаўлены ўжо названыя праслойкі. Яно здзяйсняе чыста выканаўчыя функцыі.

Якое ж значэнне маюць гэтыя змяненні?

Разгледзім класавы састаў студэнцкай моладзі. У Чылійскім універсітэце ў асноўным вучацца дзеці буржуазіі, а дзеці сялян і рабочых складаюць толькі два працэнты. Такія ж, напрыклад, суадносіны і ў Дзяржаўным універсітэце, пераважная большасць навучэнцаў якога належыць да розных рэлігійных і масонскіх сектаў або да заможных класаў.

Да сягонняшняга дня нашы універсітэты былі кузняй, якая рыхтавала буржуазную інтэлігенцыю, а гэта інтэлігенцыя служыла інтарэсам свайго класа. Маленькая група людзей, якая стаяла на чале універсітэтаў, задавальняла інтарэсы гэтага класа і ўпарта абараняла яго прывілеі.

Рэфармісты далі гэтай групе вялікі бой і выйгралі яго. Універсітэцкія ўлады былі ўстранёны. Сёння універсітэцкую палітыку вяршаць усе, хто вучыцца ці працуе ва універсітэце. Гэта адпавядае і палітычным устаноўкам Камуністычнай партыі Чылі, якая выступае за поўную дэмакратызацыю ўсяго нацыянальнага жыцця краіны. Камуністычная партыя Чылі лічыць, што барацьба за дэмакратызацыю універсітэтаў з'яўляецца састаўной часткай агульнай барацьбы народа за дэмакратызацыю краіны. І ў гэтым сэнсе рэфармісцкі рух уяўляе сабой безумоўна важны этап.

Трэба адзначыць, уплыў і прэстыж Камуністычнай партыі настолькі вялікія, так выраслі, што большая частка кіраўніцтва універсітэтаў, уключаючы рэктараў, з'яўляюцца членамі партыі.

Аднак размова ідзе не толькі аб кіраўніцтве. Рэфармісты ставяць перад сабой задачу адкрыць дзверы універсітэтаў перад тысячамі маладых людзей, якія ўсё яшчэ застаюцца за сценамі вышэйшых навучальных устаноў, хоць і даказалі, што яны здольны ў іх вучыцца. Ставіцца таксама задача радыкальна змяніць сістэму адукацыі такім чынам, каб нашы вышэйшыя навучальныя ўстановы ператварыліся ў кузню спецыялістаў, якія гатовы служыць народу і яго інтарэсам.

Маецца на ўвазе таксама адкрыць доступ ва універсітэты перадавой навуцы, новай тэхніцы, устанавіць кантакты з цэнтрамі вышэйшай адукацыі іншых краін, асабліва краін сацыялістычнага лагера.

Тут я расказаў толькі аб некаторых задачах, якія стаяць перад намі. Цяпер ідзе актыўная барацьба за здзяйсненне гэтых задач.

В. САНДОВАЛЬ,
рэдактар часопіса «Універсітэцкія сшыткі».

Пераклад Н. Будзінас,
выкладчыка іспанскай мовы БДУ.



У ЧАС ПРЫЁМУ. Фота Ю. ЛЕБЕДЗЕВА.

# КУРЫЛЁЎ С. В.



**Пасля цяжкай і працяглай хваробы на 50-м годзе жыцця памёр вядомы вучоны ў галіне грамадзянскага працэсуальнага права доктар юрыдычных навук, прафесар Сяргей Васільевіч Курылёў.**

**С. В. Курылёў нарадзіўся 2 кастрычніка 1919 года ў сям'і рабочага чыгункі. Сваю працоўную дзейнасць ён пачаў у 1938 годзе ў якасці тапографа. У 1939 годзе С. В. Курылёў быў прызван у рады Савецкай Арміі, дзе служыў на працягу шасці год. З чэрвеня 1941 года па май 1945 года ён удзельнічаў у Айчыннай вайне, быў тройчы ранен, узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі і пяццю медалямі, у тым ліку трыма «За адвагу».**

**Закончыўшы ў 1949 годзе Маскоўскі юрыдычны інстытут, а затым аспірантуру, С. В. Курылёў быў накіраван у Іркуцкі дзяржаўны універсітэт і на працягу сямі год вёў там навуковую і педагагічную працу.**

**З ліпеня 1960 па кастрычнік 1961 года Сяргей Васільевіч Курылёў быў старшым навуковым супрацоўнікам аддзела прававых навук АН БССР. Увесь далейшы перыяд яго жыцця звязан з нашым універсітэтам.**

**Сваю шматгадовую педагагічную дзейнасць С. Курылёў паспяхова спалучаў з навукова-даследчай работай. Ім апублікавана звыш 30 навуковых артыкулаў па пытаннях грамадзянска-працэсуальнага права, сямейнага права і тэорыі права. Яго навуковыя інтарэсы ў асноўным былі звязаны з распрацоўкай праблемы закона і ісціны ў савецкім правасуддзі. Па гэтай праблеме ім абаронена ў 1967 годзе доктарская дысертацыя і падрыхтавана да выдання манаграфія.**

**Шматгадовую навуковую і педагагічную работу С. В. Курылёў сумяшчаў з шырокай грамадскай дзейнасцю.**

**У нашай памяці назаўсёды захаваецца высакародны вобраз цудоўнага вучонага, чалавека вялікай працавітасці і мэтанакіраванасці, які аддаў усе свае сілы на карысць нашай Радзімы.**

**Калектыў юрыдычнага факультэта.**

# АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

*У мэтах лепшай інфармацыі прафесарска-выкладчыцкага калектыву і студэнтаў аб рабоце рэктарата, парткома, мясцкома і іншых агульнауніверсітэцкіх органаў рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» уводзіць новую рубрыку «Афіцыйны аддзел». Мы будзем сістэматычна змяшчаць важнейшыя рашэнні, прынятыя па пытаннях унутрыуніверсітэцкага жыцця, расказваць аб планіруемых мерапрыемствах, змяшчаць іншы афіцыйны матэрыял. Рэдкалегія звяртаецца да сваіх чытачоў з просьбай дапамагаць газеце весці гэты аддзел.*

## НА НОВЫМ ЭТАПЕ

Вучоны савет універсітэта зацвердзіў палажэнне аб арганізацыі навукова-метадычнай работы і формах кіраўніцтва ёю ў БДУ імя У. І. Леніна.

У мэтах удасканалення работы ва універсітэце ствараецца навукова-метадычны савет, які арганізуецца ў якасці дапаможнага органа пры вучоным савеце.

Пры савеце будуць працаваць наступныя секцыі: агульнаметадычных пытанняў (з падсекцыямі гуманітарнага і прыродазнаўчага профіляў); вытворчай практыкі, сувязі з вытворчасцю і навукова-даследчымі ўстановамі; педагагічнай практыкі і сувязі з сярэдняй школай; методыкі выкарыстання тэхнічных сродкаў у вучэбным працэсе і ўкаранення праграміраванага навучання; методыкі арганізацыі вячэрняга і завочнага навучання; методыкі ідэйна-выхаваўчай работы і рэдакцыйна - выдавецкая калегія.

Вялікае месца ў палажэнні адводзіцца вызначэнню задач кафедр.

Абмен вопытам паміж калектывамі кафедр здзяйсняюць навукова-метадычныя камісіі факультэтаў, яны ж вырашаюць праблемы агульнаметадычнага характару. Прычым у факультэцкія камісіі уключаюцца таксама прадстаўнікі студэнцкага актыву.

Стварэнне стройнай сістэмы органаў навукова-метадычнай работы і вызначэнне іх задач і абавязкаў, несумненна, дапаможа павысіць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў ва універсітэце.

## ПАТРЭБНАЕ СЯБРОЎСТВА

**Рэктарат накіраваў у вучоныя саветы факультэтаў і на кафедры пісьмо аб удзеле выкладчыкаў у рабоце шматтыражнай газеты «Беларускі універсітэт». У ім адзначаецца, што многія прафесары, дацэнты сістэматычна друкуюць свае артыкулы на старонках газеты, дзеляцца сваім вопытам. Заўсёды з цікавымі матэрыяламі выступаюць кандыдат філасофскіх навук Ю. А. Гусеў, дацэнт У. С. Багданаў, П. Л. Салаў — з фізфака, Ц. Д. Старчанка з падрыхтоўчага факультэта і іншыя. Шэраг змястоўных праблемных артыкулаў надрукавалі за апошні час прафесары М. Р. Ларчанка, Л. М. Шнеерсон, І. Г. Некрашэвіч, Л. К. Турэцкі. Разам з тым рэктарат падкрэслівае, што газета яшчэ недастаткова выкарыстоўваецца кіраўнікамі дэканатаў і кафедр у вучэбнай і выхаваўчай рабоце. Як правіла, у планах факультэтаў удзел выкладчыкаў у газеце не прадугледжваецца, газета атрымоўвае недастатковую інфармацыю з пасяджэнняў вучоных саветаў, кафедр.**

**Рэктарат рэкамендаваў абмеркаваць гэтае пісьмо на пасяджэннях кафедр і саветах факультэтаў і забяспечыць шырокі ўдзел выкладчыкаў, кіраўніцтва кафедр і факультэтаў у рабоце шматтыражкі універсітэта.**

## ПРАФСАЮЗНЫ ШТАБ

Адбылася агульнауніверсітэцкая прафсаюзная канферэнцыя, на якой падведзены вынікі работы за год. Выбран новы састаў мясцкома. Старшыня — А. А. Галаўко, намеснік — Р. А. Жмойдзяк, старшыня вытворчай камісіі — В. В. Свірыдаў, члены камісіі: Н. І. Кузьміч, М. А. Жыдовіч, Т. П. Адамовіч; старшыня палітыка-выхаваўчай камісіі — М. В. Рожын, член камісіі — В. В. Рэвіцкі; старшыня культурна-масавай камісіі—Г. І. Марцынкевіч, член камісіі — М. Ф. Кукулянская; старшыня спартыўна-масавай камісіі — В. Ф. Кавалёў; старшыня камісіі па ахове працы і тэхнікі бяспекі — А. Я. Сімакоў, член камісіі— І. П. Хрыпчэнка; старшыня жыллёва-бытавой камісіі — М. У. Мяцельскі, член камісіі—І. А. Сакалоў, старшыня камісіі грамадскага харчавання — М. І. Юзафовіч, член камісіі — М. Я. Куцэнка. Адказныя па пенсійных пытаннях — К. Я. Вінакураў, па працоўных спрэчках — М. Я. Ануфрыеў.

*Спорт*

# ПАДАРУНАК ШАХМАТЫСТАЎ

Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка закончылася першынство сярод вну рэспублікі па шахматах. Наш карэспандэнт **В. С. Яконен** папрасіла старшага выкладчыка кафедры фізвыхавання і спорту, адказнага за шахматны спорт у БДУ Е. Г. Стралецкага падзяліцца ўражаннямі ад прайшоўшых спаборніцтваў. Вось што ён расказаў:

— Добры падарунак паднёс універсітэту дружны калектыў шахматыстаў у саставе майстроў спорту В. Купрэйчыка (журфак), В. Дыдышка (матфак), кандыдата ў майстры В. Сцяпанава, першаразраднікаў Т. Капейкінай і Л. Гарэлік (матфак), І. Родава (геафак). Ва ўпорнай барацьбе з пастаяннымі канкурэнтамі — камандай політэхнічнага інстытута нашы шахматысты заваявалі першае месца.

# МАЦНЕЙШЫЯ—ГІСТОРЫКІ

У гонар 50-годдзя ВЛКСМ прайшоў розыгрыш кубка БДУ па валейболу. За права валодаць ім змагаліся каманды ўсіх факультэтаў і спартсмены мясцкома.

У фінал жаночых каманд выйшлі валейбалісткі матэматычнага і фізічнага факультэтаў. Сустрэча прайшла без асабліва вострых момантаў, не адчувалася напружанай барацьбы. Студэнткі матфака атрымалі перамогу з лікам 2:0 і сталі ўладальніцамі кубка.

Але затое захапляючым быў фінальны паядынак мужчынскіх каманд гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў. У час гульні ў зале не было раўнадушных. Сапраўдная спартыўная барацьба захапіла і спартсменаў і балельшчыкаў. З першых жа ўдараў па мячу стала зразумелым, што на пляцоўцы сустрэліся дастойныя сапернікі. Сілы каманд былі амаль роўнымі, і спачатку цяжка было вызначыць, хто ж пераможа.

Пасля змены пляцовак тэмп гульні дасягнуў вышэйшага напружання. Усё часцей даводзілася юрыстам адбіваць моцныя атакі гісторыкаў, перавага якіх стала відавочнай.

І вось фінальны свісток. Для каманды гістфака ён быў пераможным. Валейбалісты гістарычнага факультэта яшчэ раз пацвердзілі свой тытул мацнейшай каманды універсітэта.

Адказны рэдактар М. ІОСЬКА.

АТ 02477 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. № 1924.